Ахова птушак Бацькаўшчыны
ІНФАРМАЦЫЙНЫ БЮЛЕТЭНЬ

BirdLife INTERNATIONAL PARTNER

www.ptushki.org

№ 2 (49) - 2012

Меморандум о сотрудничестве подписан

Меморандум о взаимопонимании по вопросам сотрудничества в области охраны окружающей среды между Минприроды Беларуси, общественной организацией «Ахова птушак Бацькаўшчыны» (АПБ) и Королевским обществом защиты птиц (RSPB, Великобритания) был подписан 8 мая в Минске.



Слева направо: Виктор Фенчук, Майк Кларк и Владимир Цалко после подписания Меморандума.

Открывая встречу, Министр природных ресурсов и охраны окружающей среды Владимир Цалко рассказал, что Беларусь ратифицировала 27 международных договоров и конвенций, направленных на достижение этой цели. В качестве примеров, где наиболее успешно осуществляются прописанные природоохранные нормы, он назвал заказники «Споровский» и «Званец». И в данной работе есть большой вклад АПБ, подчеркнул Владимир Цалко.

Исполнительный директор Королевского общества защиты птиц Майк Кларк в Беларуси во второй раз. В 2010 году он принимал участие в знаменитых «Споровских сенокосах». «Это первая страна, которую я посетил после того, как вступил в должность два года назад», – отметил он. Майку очень нравится белорусская природа. В ходе своего пятидневного визита он успел посмотреть Полесский государственный радиационно-экологический заповедник, национальный парк «Припятский», заказник АПБ «Туровский луг».

«Благодаря сотрудничеству с Королевским обществом защиты птиц те подходы, которые вырабатывались в Великобритании и других странах Европы на протяжении десятилетий, Беларусь получила и смогла применить в самые короткие сроки. Это и создание администраций заказников, и Территорий, важных для птиц, и разработка планов действий по сохранению видов, и внедрение принципов активной охраны природы», - высказался в свою очередь директор АПБ Виктор Фенчук.

Меморандум определяет основные направления и формы сотрудничества в области охраны окружающей среды и предполагает создание рабочей группы, информирование о проблемах биоразнообразия и изменения климата, а также консультации сторон о разработке и оценке выполнения пунктов документа.

Королевское общество защиты птиц (RSPB) является самой крупной природоохранной общественной организацией в Европе. Членами RSPB являются 1 миллион человек. RSPB является стратегическим партнером АПБ и поддерживает деятельность АПБ с момента ее создания.

Источник www.wildlife.by

Создан Центр устойчивого управления водно-болотными угодьями



Символическую ленточку перерезают Председатель АПБ Александр Винчевский и исполнительный директор RSPB д-р Майк Кларк

В рамках визита исполнительного директора Королевского общества защиты птиц д-ра Майка Кларка сосоялось торжественное открытие Центра устойчивого управления водно-болотными угодьями. Центр станет структурным подразделением общественной организации «Ахова птушак Бацькаўшчыны». Создание Центра — один из результатов международного проекта «Восстановление торфяников Беларуси и применение концепции их устойчивого управления – снижение воздействия на климат с эффектом для экономики и биоразнообразия».

Сохранение водно-болотных угодий Беларуси является одним из приоритетных направлений деятельности АПБ с момента создания организации. Центр станет эффективным механизмом для общего координирования деятельности АПБ в области восстановления, сохранения и устойчивого управления водно-болотными угодьями, а также платформой для объединения различных организаций, как национальных, так и международных, по продвижению вопросов сохранения ВБУ.

На откырие Центра были также приглашены представители дипломатических миссий и международных структур, которые финансировали проекты АПБ в области управления водно-болотными угодьями — Великобритании, Германии, ПРООН, ЕС.

Виктор Фенчук, директор АПБ

Хорошие новости

Офис АПБ с октября 2012 года находится по адресу: ул. Парниковая 11.

На протяжении многих лет Республиканский экологический центр детей и юношества оказывал содействие в размещении секретариата общественной организации «Ахова птушак Бацькаўшчыны». Спасибо старому дому.



IV Фестиваль куликов собрал любителей птиц и блюза в Турове



Дети играют в «Большую гонку куликов». Фото В. Дубиловича

1 мая 2012 г. состоялся Фестиваль куликов, который традиционно проходит рядом с уникальным Туровским лугом, где в период миграции останавливаются сотни тысяч водно-болотных птиц. Фестиваль организован АПБ и Туровским горисполкомом при поддержке Посольства Королевства Нидерландов в Республике Польша и Республике Беларусь.

С каждым годом Фестиваль привлекает всё больше гостей. На открытии фестиваля с приветственным словом выступили директор АПБ Виктор Фенчук, Посол Королевства Нидерландов в Республике Польша и Республике Беларусь Марсель Курперсхук, представитель Королевского общества охраны птиц (Великобритания) Барри Купер, заместитель начальника управления биологического разнообразия Министерства природных ресурсов и охраны окружающей среды Н.И.Жаркина, первый заместитель генерального директора ИП «Кока-Кола Бевриджиз Белоруссия» А.В.Рощупкин.

В этом году Фестиваль был посвящен маленьким хозяевам Туровского луга – детям, ведь именно от них зависит, какой будет эта уникальная территория в будущем. Для школьников Турова был организован спортивно-познавательный праздник «Хозяин Туровского луга» с массой конкурсов и состязаний. Участники конкурса представили гостям Фестиваля задорные песни, веселые танцы и мини-спектакли, посвященные куликам. На сцене задорно сражались турухтаны (ученики Запесочской СШ), весело щебетали чибисы, выступали кулики-сороки и зуйки-галстучники (ученики школ № 1 и № 2 г.Турова), выступали симпатичные веретенники (Малешевская СОШ), гордо расхаживали кулики-щеголи (Вересницкая СОШ), щебетали чибисы из Хильчицкой СШ. Победителем конкурса стали озорные кулики-мородунки из Озеранской СШ. Участвуя в конкурсах и викторинах, школьники узнали о существующих серьезных угрозах куликам, таких как мелиорация поймы Припяти, весенняя охота, зарастание и загрязнение Туровского луга, весенние палы.

Познавательно-игровая программа для школьников была подготовлена совместно с Туровским центром творчества детей и молодежи.

Елена Поклонская, директор Туровского центра творчества детей и молодежи, рассказала, что в рамках подготовки к Фестивалю куликов в школах Туровщины были специально организованы уроки, посвященные птицам Туровского луга с участием орнитолога Н.Карлионовой, а также экскурсии на станцию кольцевания. Ребятам так понравились рассказы орнитологов о куликах, что они решили попробовать свои силы в конкурсе рукописных книг «Книга о Туровском луге». Две книги-победительницы – книга Малешевской СШ (1 место) и книга СШ № 1 г.Турова (2 место) – отправились в путешествие в Великобританию, чтобы рассказать английским детям о птицах Туровского луга.

Фестиваль не оставил в стороне и решение серьезных вопросов: во время рабочей встречи в Туровском горсовете был представлен проект Плана управления Туровским лугом, специалисты-экологи обсудили актуальные вопросы, касающиеся охраны уникальной территории Туровского луга.

Завершающим аккордом фестиваля стал концерт известной минской блюзовой группы «Стив Крамер Бэнд».

Лидия Пшеницына, сотрудник по экологическому образованию

Фотавыстава і экскурсіі. Усё лепшае – дзецям



Птушак-пасланцоў жывой вясны, убачаных падчас экскурсіі, школьнікі адразу рэгістравалі на сайце

Фотавыстава «У царстве выганашчанскага арлана» другі год вандравала па трох раёнах Брэсцкага рэгіёну. За няпоўныя чатыры месяцы гэтага года яе можна было ўбачыць у 11-ці навучальных установах на Івацэвіччыне, Ляхавіччыне і Ганцавіччыне.

Мабільная фотавыстава ўяўляе сабой падборку фотаздымкаў з выявамі птушак і звяроў, якія сустракаюцца на тэрыторыі заказніка «Выганашчанскае».

Варта адзначыць, што фотавыстава была створана пры падтрымцы праграмы малых грантаў пасольства ЗША. Арганізацыя выставы ў 2012 годзе праходзіць пры падтрымцы Onno de Bruijn.

Адкрыццё фотавыставы штораз суправаджалася займальнымі аповедамі пра заказнік «Выганашчанскае», нешта новае можна было даведацца пра АПБ. На такіх сустрэчах вучні ўдзельнічалі ў віктарыне на веданне таго, што адлюстроўвалася на здымках выставы. Самыя ўважлівыя атрымлівалі падарункі ў выглядзе вялікай фатаграфіі з выявай арлана-белахвоста.

Так было ад лютага да красавіка. У траўні да сустрэчаў з адкрыццём фотавыставы дадаліся і арніталагічныя экскурсіі, прысвечаныя агульнаеўрапейскай кампаніі «Жывая вясна».

З сябрамі клубу «Крылаты дазор» і вучнямі 14 школ Івацэвічаў, Івацэвіцкага раёна, Ганцавічаў і Ляхавічаў на экскурсіях мы назіралі за рознымі відамі птушак, якія сустракаюцца ў ваколіцах пэўнай школы. Асаблівая ўвага надавалася беламу буслу, вясковай ластаўцы, зязюлі і чорнаму свіргулю як прадстаўнікам жывой вясны. Асаблівую цікавасць выклікалі белыя буслы, бо за імі экскурсантам можна было бясконца назіраць у трубу. На такіх экскурсіях мы звярталі ўвагу на цікавыя экалагічныя асаблівасці адзначаных відаў птушак. Кожная экскурсія, як і адкрыццё фотавыставы, суправаджалася інтэрактыўнымі гульнямі, якія не давалі школьнікам згубіць увагу.

Лагічным вынікам нашых экскурсій стала размяшчэнне сваіх назіранняў на сайце «Жывой вясны». Пры дапамозе мабільнага інтэрнэту ніводнае назіранне не засталося ўбаку, а экскурсанты тым самым маглі навучыцца карыстацца адпаведным сайтам і потым самастойна дадаваць уласныя назіранні.

Юлія Трацяк, рэгіянальны каардынатар праекта
Фота аўтара

Домікі для свіргулёў



Домікі-пераможцы ў намінацыі «Функцыянальны стандартны домік для свіргуля»

30 сакавіка стартаваў конкурс «Домік для свіргуля», які каардынаваўся Рэсурсным цэнтрам па адукацыі ў інтарэсах устойлівага развіцця ДУА Гімназія № 19 г. Мінска, грамадскай арганізацыяй «Ахова птушак Бацькаўшчыны», Мінскім гарадскім камітэтам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя пры падтрымцы будаўнічага холдынга «Сармат». На конкурс было прадстаўлена 55 гнездавых скрынь з 23 установаў адукацыі г. Мінска і 1 домік з Магілёва (ДУА СОШ №28).

Трэцяга траўня журы падвяло вынікі конкурса з улікам наступных крытэрыяў:

- адпаведнасць стандартам (памер і размяшчэнне лятка),
- функцыянальнасць,
- эстэтычнасць.

Перавага аддавалася гнездавым скрыням без прымацаванняў, бо прымацавальныя палкі абмяжоўваюць спосабы развешвання скрынь на дамах. Аднак улічваючы, што ў мэтах конкурса і ў рэкамендацыях не згадваўся гэты пункт, журы палічыла магчымым вылучыць пераможцаў у наступных намінацыях: «Функцыянальны стандартны домік для свіргуля» (без прымацаванняў) і «Функцыянальны домік для свіргуля» (з прымацаваннем).

Пераможцамі ў намінацыі «Функцыянальны стандартны домік для свіргуля» сталі:

I месца – Бондар Антон, 9 «А» клас СШ № 140 г. Мінска – Кажамякін Міхаіл, 9 клас СШ № 28 г. Магілёва

II месца – Ярмак Аляксей, 9 «А» клас СШ № 179 г. Мінска

III месца – Галдовіч Валянцін, 9 «Б» клас СШ № 15 г. Мінска

Пераможцамі ў намінацыі «Функцыянальны домік для свіргуля» сталі:

I месца – Сянько Аляксей, 8 «А» клас СШ № 132 г. Мінска

II месца – Гармаш Максім, 10 «А» клас СШ № 125 г. Мінска

III месца – Якубоўская Ірына, 6 «А» клас Гімназии №19 г. Мінска

Улічваючы, што на конкурс было прадстаўлена шмат прац крэатыўнага характару з захаваннем функцыянальнасці, журы вырашыла вылучыць тры лепшыя працы ў намінацыі «Крэатыў». Лепшымі ў гэтай намінацыі сталі: Зеленчыц Ганна, 1 «А» клас ПШ № 39 г. Мінска, Філімонава Елізавета, 2 «В» клас ПШ №39 г. Мінска і Марціновіч Ілля, 9 «А» клас СШ № 72 г. Мінска. Аднак варта памятаць, што такія гнездавыя скрыні могуць служыць толькі ўпрыгожваннем або макетам.

Святлана Якубоўская, старшыня Мінскага гарадскога аддзялення АПБ
Фота аўтара

Новые Правила ведения охотничьего хозяйства и охоты. Скоро будем стрелять во все, что летит?



В настоящее время Министерством лесного хозяйства ведется работа по внесению изменений и дополнений в Указ Президента Республики Беларусь № 580 «О некоторых мерах по повышению эффективности ведения охотничьего хозяйства и рыбохозяйственной деятельности, совершенствованию государственного управления ими».

Данная работа инициирована в рамках реализации поручения Президента Республики Беларусь. 19 июня 2012 года на сайте Министерства лесного хозяйства был размещен проект новой редакции Правил (http://mlh.by/ru/news/1739.html).

Представленный проект Правил ведения охоты и охотничьего хозяйства полностью перечеркивает все положительные шаги, которые Минлесхоз предпринял в рамках предыдущей редакции Правил в плане минимизации влияния охоты на птиц.

Несмотря на научные данные о существенном снижении численности водоплавающих птиц в Республике Беларусь, новая редакция Правил предлагает резкое увеличение количества охотничьих видов уток — с одного (кряква) до десяти. При этом, в список охотничьих видов включили даже шилохвость — вид, занесенный в Красную книгу Республики Беларусь.


Расширяя список видов птиц, на которые предлагается разрешить весеннюю охоту, Минлесхоз одновременно предлагает практически в два раза увеличить сезон весенней охоты. С начала марта по начало мая — практически полностью перекрывая гнездовой сезон для водоплавающих птиц.

Мышиное лобби в действии

Отдельных комментариев также заслуживает предложение Минлесхоза в два раза расширить список нежелательных видов диких животных. В частности, Минлесхоз предлагает объявить войну трем видам дневных хищных птиц. Кому и как помешали канюк и болотный лунь — патрули белорусских полей и лугов, основной пищей которых являются мышевидные грызуны — абсолютно непонятно. Фактически же, это будет означать войну всем дневным хищникам — то, что Беларусь пережила во времена Советского союза, когда многие хищные виды были поставлены на грань уничтожения.

За примерами того, как в современной Беларуси ведется война с нежелательными видами, далеко ходить не надо. Пример с бакланами на колонии в Новолукомле еще свеж.

15 минут, чтобы помочь птицам



Дорогие друзья,

Думаю, что вы все потрясены ситуацией с бакланами в Новолукомле. В настоящее время по данному инциденту ведется расследование, и мы будем следить за тем, чтобы виновные в этом варварстве были привлечены к ответу.

К сожалению, данный инцидент является далеко не единичным в «войне» с нежелательными видами – бакланами, цаплями. Жертвами этой войны становятся и другие птицы, включая краснокнижных белых цапель, а примеры жестокости периодически появляются в прессе. Поэтому, кроме наказания виновных в случае в Чашниках, очень важно, чтобы были приняты меры, исключающие повторение такого в будущем.

Сейчас для этого есть как раз подходящий момент. В настоящее время Министерством лесного хозяйства ведется работа по внесению изменений и дополнений в Правила ведения охотничьего хозяйства и охоты. В порядке обсуждения, на сайте Минлесхоза опубликован проект новой редакции Правил.

К сожалению, представленный проект Правил ведения охотничьего хозяйства и охоты не только не помогает решить проблему войны с бакланами, но и полностью перечеркивает все положительные шаги, которые Минлесхоз предпринял в рамках предыдущей редакции Правил.

Среди всего прочего, наиболее существенными являются следующие предложения:

1. Увеличить количество охотничьих видов уток, на которые можно охотиться весной, с одного (кряква) до девяти. При этом, в список охотничьих видов предлагают включить даже шилохвость — вид, занесенный в Красную книгу Республики Беларусь.
2. Увеличить в 2 раза сроки весенней охоты на уток. Предлагаемый сезон – с начала марта по начало мая — практически полностью перекрывается с гнездовым сезоном для водоплавающих птиц.
3. Расширить в 2 раза список нежелательных видов и включить в него 5 новых видов птиц. В частности, Минлесхоз предлагает объявить войну трем видам дневных хищников: ястребу-тетеревятнику, канюку и болотному луню.
4. Снизить «возрастную планку» охотников. Предлагается внести в Правила изменения, согласно которым охотиться смогут граждане, достигшие всего лишь 14-летнего возраста.

Эти предложения просто не поддаются разумному объяснению. Принятие этих предложений нанесет огромный урон водоплавающим птицам, численность которых в нашей стране и так стремительно падает. Пострадают все хищные птицы, которых будут стрелять без разбора, а страшнее всего, что к этому процессу будут приобщены молодые люди, те, в чьих руках находится будущее нашей природы. (http://ptushki.org/info/press/item/8175.html).

Как Вы можете помочь

Вам понадобится всего лишь 15 минут, чтобы помочь птицам. Сейчас Министерство лесного хозяйства и Министерство природных ресурсов собирают комментарии общественности по поводу проекта Правил.

Я прошу вас выразить свое несогласие с предлагаемыми изменениями в Правила ведения охотничьего хозяйства и охоты, которые предлагает Министерство лесного хозяйства, и обратиться с требованием:

- Закрыть весеннюю охоту на водоплавающих птиц и сократить список охотничьих видов уток
- Не допустить расширение списка нежелательных видов и включение в этот список хищных видов пиц
- Принять меры, чтобы ситуация, которая случилась в Новолукомле с бакланами, не повторилась в будущем. Для чего разрешить регулирование баклана только на территории рыбоводных хозяйств

Перейдите по ссылкам и донесите ваше мнение до Министерства лесного хозяйства и Министерства природных ресурсов.

1. Общественная приемная Минлесхоза: **http://mlh.by/ru/contacts/form.html**

2. Общественная приемная Минприроды: **http://minpriroda.by/ru/priemn/social_reception/fiz**

Не откладывайте это на потом. Сделайте прямо сейчас.

Спасибо!

Виктор Фенчук, директор АПБ

Дмитрий Уткин

Такое отношение к живым существам есть фашизм. Вначале к животным, затем в отношении людей.

Владимир Зубко, Заместитель начальника отдела охотничьего хозяйства Минлесхоза

Поступили такие предложения к нам, вот мы их и рассматриваем. И это не Минлесхоз кулуарно что-то разрабатывал. Создана рабочая группа, куда входит не только Минлесхоз, но и Минприроды, Госинспекция по охране животного мира, БООР, НПЦ по биоресурсам Академии наук Беларуси, Управление делами президента Беларуси и, кроме того, представители частных пользователей охотничьих угодий. Это наработки рабочей группы». Сезон пролета уток сейчас растянут: они то в феврале летят, то в конце апреля. Мол, сложно угадать охотнику, когда утка будет лететь. Расширение сезона охоты сделано для удобства охотников. Хотя, я бы оставил одну крякву, как это и было.

Сергей Зуенок, орнитолог

Странно, что тысячи рядовых граждан оценивают ситуацию куда адекватнее, чем специалисты из рафинированной «рабочей группы», накропавшие эти «наработки».

Ольга Тимохина, «Салідарнасць»

Я представляю, как человек берет теплое тельце испуганного птенца, придерживает его пушистую голову и отрезает ему клюв… Представьте и вы, как бы это ни было мучительно. Может быть, тогда у нас – и социума, и страны, и человека, и птицы – будет шанс на спасение…

Живая весна





Ужо сёмы год у нашай краіне праводзіцца агульнаеўрапейская кампанія па назіранні за веснавым прылётам птушак – Жывая Вясна (Spring Alive). У гэтым годзе мы назіралі за прылётам пяці пасланак вясны – белага бусла, вясковай ластаўкі, звычайнай зязюлі, чорнага свіргуля і шчуркі-пчалаедкі.

Дарэчы, першы белы бусел быў адзначаны 10 сакавіка, у той жа дзень была ўбачана першая вясковая ластаўка, 27 сакавіка – звычайная зязюля, чорны свіргуль – 27 красавіка. Рэдкіх для Беларусі шчурак-пчалаедак увогуле зарэгістравана 11.

У сёлетняй кампаніі прымалі ўдзел арнітолагі, кіраўнікі і сябры Крылатых дазораў і проста аматары прыроды і птушак. На працягу кампаніі выходзіла інфармацыя пра прылёт чарговай птушкі. Кіраўнікамі Крылатых дазораў праводзіліся экскурсіі па тэматыцы Жывой Вясны, быў арганізаваны фотаконкурс "Маё першае назіранне", у якім ад Беларусі прынялі ўдзел 9 чалавек. На жаль, сярод пераможцаў беларусаў няма (першае месца атрымала польская дзяўчынка), але ўсе яны атрымаюць маленькія падарункі з наступнай рассылкай.

У выніку Беларусь назбірала 1272 назіранні з агульнай колькасці 170824 і заняла 7-ае месца сярод 38 еўрапейскіх краін. Трэба адзначыць, што больш за ўсё назіранняў атрымала Брэсцкая вобласць – 517, далей Мінская – 489, Віцебская – 126, Гродзенская – 84, Гомельская – 38 і Магілёўская – 18.

Калі казаць пра лепшых удзельнікаў, тут першае месца падзяляюць КД Слуцкага раёна – 426 назіранняў і Баранавіцкі КД – 336 назіранняў.

Мы вельмі ўдзячныя ўсім удзельнікам Жывой Вясны за цікаўнасць да кампаніі і любоў да птушак. Будзем разам атрымліваць асалоду ад лета, восені, зімы і чакаць Жывой Вясны-2013!

Ліза Сіткевіч,
каардынатар Жывой Вясны-2012

Лучший соловей Минска



В этом году впервые была предпринята попытка определить лучшего соловья города. По словам эксперта проекта Виталия Яковича, в пении минских соловьев стали появляться отдельные колена, которые не подлежат определению и не имеют названий относительно общепринятых названий колен песни соловья. И это не удивительно, ведь соловей – композитор, его песня изменяется, появляются новые звуки в репертуаре. К сожалению, традиции прослушивания соловьев давно утеряны. По мнению Виталия, именно акция «Соловьиные вечера» способна хоть на миг вернуть нас в те забытые времена, когда люди ради прослушивания чарующих птичьих песен готовы были преодолеть тысячи верст.

Во время прослушивания соловьев в Минске специалисты установили, что особенно четко звучали такие группы колен, как «водопойные дудки», «стукотня», «свисты». А вот «дроби» и «раскаты» были короткими и нечеткими. «К сожалению, акция стартовала очень поздно – констатирует эксперт Виталий Якович, — а для полноценного прослушивания соловьев необходимо ее начинать еще в начале мая, когда соловьи поют намного лучше и больше».

Традиционно, подготовлена Соловьиная карта Минска-2012, на которой отмечено место лучшего пения соловья. Всего в городе учтено более 300 мест активного пения соловьев. У лучшего соловья в песне присутствует более 12-ти колен. Это не рекорд, но среди поющих в нынешнем году соловьев в Минске — это был лучший певец. Лучший соловей поет в микрорайоне «Дрозды» на левом берегу Свислочи.

АПБ выражает благодарность всем, кто сообщил о местах пения соловьев в Минске, а также другие интересные факты о птицах.

До новых соловьиных встреч в следующем году!

Руслан Шайкин,
координатор акции «Соловьиные вечера в Минске»

Сезон орнитологических экскурсий для пожилых в самом разгаре

Лето – время увлекательных экскурсий для пожилых людей – участников проекта АПБ «Вовлечение пожилых людей в активную природоохранную деятельность через организацию их досуга: Птицам все возрасты покорны».

Проект реализуется в рамках программы «Место встречи – диалог» при финансовой поддержке Фонда «Память, ответственность и будущее» в сотрудничестве с Международным общественным объединением «Взаимопонимание». Проект стартовал в октябре 2011, и за это время удалось провести немало интересных экскурсий и встреч. С начала весны участники проекта своими руками сделали домики для пустельги в заказнике «Соколиный», построили и развесили искусственные гнездовья для стрижа – Птицы года 2012, наблюдали за птицами в окрестностях Белорусского государственного музея народной архитектуры и быта в Строчицах, посетили Березинский биосферный заповедник, изучали дикую природу Гродненской и Витебской областей. Пожилые люди не остались в стороне от популярной акции



«Соловьиные вечера». Участники проекта, вооружившись биноклями, слушали и считали соловьев в Лошицком садово-парковом комплексе в Минске, наслаждались их пением в окрестностях Борисова, Шумилино и Сморгони. В августе участники проекта отправятся на экскурсии в лес за целебными травами, а в сентябре 2012 запланировано проведение чемпионата по спортивной орнитологии для пожилых людей. Чемпионат создаст условия для появления у пожилых людей новых жизненных импульсов и интересов в области охраны природы, позволит привлечь внимание общества к пожилым людям как к активным защитникам природы и тем самым повысит их социальный статус. Приглашаем всех желающих принять участие в чемпионате по спортивной орнитологии для пожилых людей!

Лидия Пшеницына,
координатор проекта



Птушкі горада

На замову Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя пры падтрымцы АПБ выйшла новая брашура «Птушкі горада». У выданні разглядаюцца пытанні арганізацыі назіранняў за птушкамі ў горадзе, біятэхнічных мерапрыемстваў па майстраванню штучных гняздоўяў і кармушак для птушак. Важнай часткай выдання стаў раздзел, прысвечаны непажаданым дзеянням для дзікіх птушак з боку чалавека. Напрыклад, чаму нельга падкармліваць вадаплаўных птушак, забіраць птушанят і г.д. Брашура распаўсюджваецца бясплатна на прыродаахоўных і асветніцкіх семінарах, дзіцячых конкурсах і сустрэчах.

Крылатыя сябры двух кантынентаў змогуць наведаць беларускія школы



Руслан Шайкін распавядае пра птушак на фатаграфіях

З 26 красавіка па 3 траўня ў сталічным кінатэатры «Кастрычнік» Цэнтр турызму і краязнаўства дзяцей і моладзі Мінскага раёна «Ветразь» праводзіў аўтарскую выставу аматарскай фатаграфіі Руслана Шайкіна «Птушкі Беларусі і ЗША», на якой былі прадстаўлены каля 50 фотаздымкаў птушак двух кантынентаў.

Усе фатаграфіі маюць арыгінальныя подпісы з кароткімі звесткамі аб птушках Беларусі і Паўночнай Амерыкі. У подпісах наўмысна няма лацінскіх назваў і падкрэсленай навуковасці – толькі цікавыя факты аб крылатых сябрах.

Фотавыстава перш за ўсё планавалася як сродак экалагічнага выхавання, для таго, каб старэйшыя школьнікі маглі праводзіць для малодшых віртуальную экскурсію ў свет птушак. Любая школа Беларусі, якая пажадае, можа звярнуцца ў Цэнтр **(8017 263 01 30)** і атрымаць гатовую фотавыставу ў электронным выглядзе для некамерцыйнага выкарыстання ў рамках экалагічнага выхавання школьнікаў з захаваннем аўтарскіх правоў. Навучальная ўстанова можа самастойна раздрукаваць фатаграфіі і каментарыі да іх і правесці ў сябе фотавыставу.

Ад настаўніка патрабуецца толькі падрыхтаваць некалькі старшакласнікаў, якія б маглі самастойна правесці выступленне для вучняў пачатковых і сярэдніх класаў школы, расказаць ім шмат цікавай інфармацыі аб птушках ужо толькі па гэтых подпісах. Карысць двайная, бо тут атрымаюць веды не толькі меншыя дзеці, але і старшакласнікі, якія, безумоўна, самі запомняць птушак, авалодаюць пэўным аратарскім майстэрствам, навучацца адказваць на пытанні, якія задаюць дзеці, і ўвогуле выступяць у якасці лідараў экалагічнага выхавання і адукацыі.

Хочацца спадзявацца, што гэтую фотавыставу чакае доўгае жыццё ў сценах навучальных устаноў краіны, а школьнікі змогуць атрымаць не толькі тэарэтычныя веды, але і пачнуць пазнаваць на вуліцы дагэтуль невядомых птушак, як кажуць, «у твар».

Па матэрыялах артыкула Людмілы Гурскай, карэспандэнта «Настаўніцкай газеты»

Осенние дни наблюдения за птицами

Принимая участие в осенних днях наблюдений за птицами, проводя простейшие подсчеты птиц своей местности, любители природы вносят свой посильный вклад в массовое экологическое мероприятие европейского масштаба. Для участия необходимо 6-7 октября самостоятельно или с группой друзей или воспитанников выйти на природу и посчитать виды птиц, а также их количество. Все данные необходимо записать в полевой дневник, блокнот или тетрадь. Отмечается также количество птиц, которых не удалось определить. Информацию необходимо сообщить в секретариат АПБ по телефону в Минске (017) 263 06 13, по мобильным телефонам: (029) 223 06 13 (МТС), (029) 101 68 87 (Velcom), SMS-сообщением на короткий номер 0841 или по e-mail: info@ptushki.org.

Последний день подачи информации – 7 октября, не позже 16.00.

Наблюдения и учеты можно проводить везде, где живут птицы. Это лес, луг, поле, река или озеро. В городе можно посетить ближайший парк, сквер, фруктовый сад или другие места и объекты. В случае если проводится несколько экскурсий в один или разные дни, необходимо учитывать птиц разными маршрутами. Посещение одних и тех же мест нежелательно, т. к. увеличивается возможность повторного учета птиц, что значительно ухудшает результат.

Дзень салаўя ў Слуцку



Сябры Слуцкага аддзялення на фоне скульптуры салаўя

У 2011 годзе юныя арнітолагі клубаў «Крылаты дазор» ДУА Слуцкі эколага-біялагічны цэнтр навучэнцаў распрацавалі праект «Птушка – прыродны сімвал Слуцкага раёна». Шляхам апытання і анкетавання жыхароў (было сабрана больш за 1000 анкет) прыродным сімвалам быў абраны салавей. У ходзе рэалізацыі праекта была створана малая скульптурная форма – драўляная скульптура салаўя (адкрыццё адбылося 15 траўня 2012 года), распрацаваны рэкамендацыі па захаванню месцаў гнездавання гэтай птушкі. Кожны год, беручы ўдзел у акцыі «Салаўіныя ночы», сябры арганізацыі адсочваюць колькасць салаўёў і месцаў іх гнездавання шляхам асабістых назіранняў і паведамленняў жыхароў рёна. Супрацоўнікі і выхаванцы гурткоў Цэнтра пачалі збор матэрыялаў і экспанатаў пра салаўя з мэтай стварэння першага ў Беларусі музея салаўя. Гэта павінна спрыяць станоўчаму іміджу Слуцкага раёна на рэспубліканскім узроўні ў галіне практычных прыродаахоўных мерапрыемстваў і турызму.

Ініцыятыўная група, што працавала над праектам, звярнулася ў раённы Савет дэпутатаў з просьбай аб прыняцці рашэння аб зацверджанні салаўя як прыроднага сімвала Слуцкага раёна і Праграмы мерапрыемстваў па рэалізацыі прыродаахоўнай канцэпцыі ў Слуцкім раёне «Салавей – прыродны сімвал Слуцкага раёна».

15 траўня 2012 года юныя арнітолагі правялі праграму «Мы з салаўінага краю», запрасіўшы на яе жыхароў горада з «салаўінымі» прозвішчамі, гасцей парадавалі вершамі, песнямі пра салаўёў і тортам з адпаведным надпісам, спецыяльна прыгатаваным для гэтай даты.

Наталля Бурачэнка, старшыня Слуцкага раённага аддзялення АПБ
Фота аўтара

Сертыфікаты для захавальнікаў ТВП «Балота Ельня»

Адной з першых тэрыторый, дзе АПБ пачала ствараць сетку захавальнікаў ТВП, стала балота Ельня. З першага валанцёрскага летніка ў 2007 годзе, у камандзе «выратавальнікаў» аказаліся жыхары рэгіёна – сям'я Казачонак з Міёрскага раёна і Валерый Кавалёнак з г.п. Шаркаўшчына. Праз пяць гадоў у Ельні з'явілася самая вялікая каманда захавальнікаў у Беларусі – амаль трыццаць чалавек! Нехта браў удзел у штогадовых летніках, нехта дапамагаў ва ўліках жураваў, праводзіў школьныя заняткі, прысвечаныя Ельні, дзяліўся сваімі назіраннямі са спецыялістамі – кожны стараўся аддаць часцінку сябе любімаму балоту.



28 чалавек атрымалі сертыфікаты захавальніка

У канцы лютага была арганізавана сустрэча захавальнікаў ТВП «Балота Ельня» з супрацоўнікамі заказніка «Ельня», Міёрскай раённай інспекцыі аховы прыроды і аховы навакольнага асяроддзя, АПБ.

Дырэктар заказніка Іван Барок пазнаёміў удзельнікаў сустрэчы з існуючым ахоўным рэжымам і акрэсліў праблемы, што звязаны з кантролем яго падтрымання. У прыватнасці, вельмі востра стаіць праблема паездак на тэрыторыі заказніка. Кожны квадрацыкл або джып пакідае пасля сябе глыбокую каляіну, што ператвараецца ў канал, па якім вада выходзіць з балота. Таму выключнае значэнне мае інфармацыя пра падобныя выпадкі, якая дапамагае знайсці парушальнікаў. У такіх момантах на дапамогу якраз і прыходзяць захавальнікі, бо прасачыць за вялізнай тэрыторыяй невялікаму штату супрацоўнікаў вельмі няпроста.

Удзельнікі таксама абмеркавалі і магчымасці дапамогі заказніку ў выяўленні новых і маніторынгу існуючых месцаў, дзе маюцца рэдкія віды раслін і жывёл, перададзеных пад ахову.

У канцы сустрэчы дваццаць восем захавальнікаў ТВП «Балота Ельня» атрымалі сертыфікаты захавальніка – гэта першы падобны вопыт, які ў будучым будзе распаўсюджаны і на іншыя тэрыторыі. Сустрэчы папярэднічала фотавыстава Валерыя Кавалёнка «Нашы птушкі», пра якую сам аўтар распавёў вучням школы №3 г. Міёры – яшчэ адзін яскравы прыклад дзейнасці захавальнікаў.

Вольга Лукшыц, спецыяліст па прыродаахоўных пытаннях
Фота аўтара

Рэдкая птушка побач з домам

Чарговую экскурсію для клуба «Рэдкая птушка» мы вырашылі прысвяціць пошуку драча ці дзяргача (рус. коростель). Ужо пасля аб'яўлення экскурсіі да нас пачалі тэлефанаваць людзі, якія жадалі паведаміць пра вядомыя ім месцы гнездавання драча. Адным з іх быў Андрэй Прыгун. Так сталася, што драчы жывуць недалёка ад яго дома ў Мінску. Ён налічыў іх пяць штук, а аднаго нават падманіў да сваіх ног голасам птушкі, запісаным на мабільны тэлефон.



Менавіта туды мы вырашылі накіравацца з экскурсіяй. Поле, якое абралі для гнездавання драчы, знаходзіцца літаральна праз дарогу ад жылога шматпавярховага дома. На гэты раз разам з «Рэдкімі птушкамі» да экскурсіі далучылася шмат дзяцей.

Дачакаўшыся цемры і папрасіўшы дзяцей не шумець, узброеныя ліхтарыкамі і магнітафонам с запісам голасу драча, мы рушылі ўглыб поля. Драч амаль адразу адазваўся на нашу магнітафонную правакацыю, і ўсе застылі на месцы ў чаканні: няўжо птушка выйдзе да нас з густых зарасцяў? Але драч, наадварот, адышоў далей. Напэўна, вялікая колькасць людзей яго ніякім чынам не прываблівала. Тады наперад выйшлі два больш дасведчаныя ў гэтай справе чалавекі: дырэктар АПБ Віктар Фянчук і Андрэй Прыгун. Мы назіралі, як яны, седзячы ў траве і накіраваўшы ліхтарык у бок птушкі, спрабавалі прыцягнуць яе голасам, які беспярапынна гучаў з магнітафона. Як яны распавялі пазней, драч падышоў даволі блізка і нават паказаў галаву над травой, але ў апошні момант усё ж вырашыў павярнуць назад.

Пакінуўшы ў спакоі гэтага драча, мы пайшлі шукаць яго суродзічаў. Усяго мы налічылі чатыры птушкі, але ніводная з іх не згадзілася выйсці «на свята». Аднак нам пашчасціла ўбачыць вушастую саву, якая завітала на поле, хутчэй за ўсё, падчас палявання.



Спадзяёмся, што ўдзельнікі экскурсіі ўжо не забудуць знакамітае «крэкс-крэкс» драча, а хтосьці, можа, і сустрэне гэтую птушку, гуляючы па полі каля свайго дома.

Кацярына Ціхно.

Фота аўтара. P.S. Запрашаем усіх жадаючых далучыцца да клуба "Рэдкая птушка". Для гэтага дашліце ліст на адрас info@ptushki.org

Актыўная ахова жывой прыроды!





Паўгады таму стартаваў праект Брэсцкага абласнога аддзялення АПБ «Далучэнне цяжкай моладзі і грамадскасці да вырашэння праблем рэдкіх відаў млекакормячых сямейства соняў ».

Усе віды сонь – гэта лясныя жывёлы, большасць з якіх ахоўваецца. Аб распаўсюджанні, біялогіі і экалогіі сямейства ў нашай краіне вядома вельмі мала. Да таго ж, большасць жыццядзейнасці сонь звязана з высакаўзроставымі шыракалістымі альбо змешанымі лясамі з наяўнасцю добра развітага падлеску, старых дуплістых дрэў. На жаль, наша лясная гаспадарка адмоўна ўплывае на плошчу падобных біятопаў. Шыракалістыя і стараўзроставыя лясы вынішчаюцца і замяняюцца на хваёвыя насаджэнні. Дуплістыя дрэвы лічацца непатрэбнымі ў лясной гаспадарцы і выдаляюцца з лесу. Так званая «ачыстка лесу ад старызны» таксама не спрыяе паляпшэнню ўмоў існавання гэтых відаў. Менавіта таму соні былі абраныя аб'ектам дзейнасці праекта. Акрамя таго, нягледзячы на слабую вывучанасць і прыхаваны лад жыцця, гэтыя віды вельмі ахвотна адгукаюцца на дапамогу, то бок добра засяляюць штучныя гнездавыя скрыні.

У межах праекта запланавана шмат розных мерапрыемстваў. Частка з іх ужо рэалізавана, частка яшчэ наперадзе. Апрацаваны і распаўсюджаны па лясніцтвах адмысловыя анкеты, якія датычаць выяўлення месцаў сустрэчы з відамі, падрыхтавана методыка правядзення даследаванняў распаўсюджання відаў, выраблена каля 100 гнездавых скрынь, палова з якіх ужо развешана ў адпаведных біятопах. У праектнай дзейнасці сёння удзельнічае 6 школ, якія разам з арганізатарамі праекта прымаюць актыўны ўдзел у вырабе гнездавых скрынь і развешванні іх у прыродзе. На працягу студзеня-траўня адбылося 4 семінары для настаўнікаў, супрацоўнікаў дзяржінспекцыі і лясной гаспадаркі, а таксама вучняў Брэсцкага, Маларыцкага і Кобрынскага раёнаў, у якіх прынялі ўдзел больш за 100 чалавек. Падчас семінараў удзельнікі даведаліся пра АПБ, атрымалі інфармацыю аб метадах актыўнай аховы прыроды, экалагічнай адукацыі і, вядома ж, аб сонях, абмеркавалі магчымасці сумеснай дзейнасці.

У рамках дня птушак у пачатку красавіка адразу ў некалькіх школах у Маларыце пад кіраўніцтвам Кіцель Алены Пятроўны і Шкабара Рамана былі арганізаваны майстар-класы па вырабе гнездавых скрынь для сонь і птушак. Напярэдадні яшчэ экскурсіі ў прыроду для вучняў, а таксама апрацоўка праграмы аховы відаў, працяг вырабу і развешвання скрынь і іншыя мерапрыемствы. Таму, калі хто з кіраўнікоў клубаў «Крылаты дазор» з Брэсцкай вобласці зацікавіўся актыўнай аховай сонь, звяртайцеся да нас.

Андрэй Абрамчук, старшыня Брэсцкага абласнога аддзялення АПБ
тэл. + 375 29 725 32 16
Фота Ліхван В. и Шкабара Р.

Лагерь Ельня

Общественная организация «Ахова птушак Бацькаўшчыны» приглашает волонтеров принять участие в лагерях на болоте Ельня в Витебской области, которые традиционно проводятся в конце лета в рамках проекта «Спасем Ельню вместе!» финансируемого ИП «Кока-Кола Бевриджиз Белоруссия»

Цель лагеря – ремонт плотин для поддержания водного баланса на болоте после восстановления гидрологического режима.

Даты лагерей:

- 30 июля – 3 августа;
- 5 августа – 8 августа;
- 17 августа – 21 августа;

Записаться в лагерь можно по телефонам:
8-017-263-06-13,
8-029-223-06-13 (МТС),
8-029-101-68-87 (velcom)

Контактные лица:
Ольга Лукшиц или Анна Трофимчук
e-mail: lukshyts@ptushki.org
Более подробную информацию можно получить на сайте АПБ (новость за 10.07.2012).

Не забудзьце прыняць удзел: Чэмпіянат па спартыўнай арніталогіі

Запрашаем прыняць удзел у IX чэмпіянаце па спартыўнай арніталогіі. Сёлета ён адбудзецца ў другую суботу восені – 8 верасня.

Удзел у чэмпіянаце можа прыняць кожны ахвотнік, у тым ліку грамадзяне замежных краін. Для гэтага патрэбна падаць у Сакратарыят АПБ заяўку (па тэлефонах 017-263-06-13, 029-223-06-13 МТС, 029-101-68-87 velcom альбо электроннай поштай info@ptushki.org), у якой будзе ўказана назва каманды, яе склад (4 чалавекі; мінімум двое павінны быць старэйшыя за 18 гадоў), месца старту і нумар тэлефона для сувязі. Апошні тэрмін падачы заявак – 30 жніўня 2012 г. 31 жніўня ва ўдзельнікаў будзе магчымасць унесці карэктывы ў заяўкі.

З падрабязнымі правіламі правядзення чэмпіянату вы можаце пазнаёміцца на нашым сайце (Правілы чэмпіянату па спартыўнай арніталогіі) альбо ў Сакратарыяце.

Ахова птушак Бацькаўшчыны
ІНФАРМАЦЫЙНЫ БЮЛЕТЭНЬ
№ 2 (49) - 2012

АПБ з'яўляецца нацыянальным партнёрам BirdLife International, глабальнай асацыяцыі прыродаахоўных арганізацый

(с) АПБ, 2012 Інфармацыйны бюлетэнь
ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны",
Галоўны рэдактар: Фянчук Віктар Аляксандравіч
Рэдакцыйная рада:
Левы Сямён Васільевіч
Лукшыц Вольга Уладзіміраўна
Зуёнак Сяргей Васільевіч
Шайкін Руслан Валянцінавіч
Вёрстка: Зміцер Гупянец

№ 1, 2012 год
Рэгістрацыйны №726
ад 12.10.2009 г.
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Наш адрас:
ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны",
вул. Макаёнка, 8-313, 220114,
Мінск Беларусь
Тэл. (017) 263 01 30,
Факс (017) 263 06 13
(029) 223 06 13 МТС

(029) 101 68 87 velcom
E-mail: info@ptushki.org
www.ptushki.org
Для карэспандэнцыі
а/с 306, Мінск, 220050, Беларусь

Дзейнасць ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны" падтрымліваецца Каралеўскім таварыствам аховы птушак (RSPB), партнёрам BirdLife International у Вялікабрытаніі.

Надрукавана ў друкарні УП "Данарыт".
Ліцэнзія ЛП № 02330/0494183 ад 03.04.2009.
Наклад паас.
Передрук дазваляецца пры ўмове спасылкі на "Інфармацыйны бюлетэнь"
Замова №